этим надо открыто признать, что на первой ступени высшего образования невозможно и не нужно стремиться к исчерпывающей полноте научного содержания преподаваемых социально-гуманитарных дисциплин. Невозможно потому, что для этого нет и не будет достаточного объема учебных часов; не нужно в силу того, что на первой ступени современного высшего образования строгий академизм приобретает преимущественно внешний, формальный характер и не обеспечивает ни усвоения знаний, ни формирования зрелых личностных убеждений студентов. Благополучие в зачетных книжках и экзаменационных ведомостях далеко не всегда свидетельствует о действительно высоком качестве социально-гуманитарного образования в вузах.

В рамках уже сложившейся организации вузовского социально-гуманитарного образования произвести перемены, способствующие повышению его действительного качества. Необходимо приступить к разработке нового пакета учебных программ по дисциплинам данного цикла. Ближайшим образом необходимость этого обусловлена введением в школах интегрированного курса обществоведения, в котором присутствуют некоторые вопросы, традиционно изучаемые в вузах. Таких вопросов немного, но они есть, и дублирование школьной и вузовских учебных программ следует устранить. Путь продвижения к должному качеству высшего социально-гуманитарного образования видится в том, чтобы осуществить его действительную фундаментализацию, отобрав для рассмотрения в каждой из таких дисциплин основополагающие учения и идеи, показав их связи с другими научными положениями и идеями, раскрыв их философские и социокультурные предпосылки, а также жизненно-практические следствия, и передав для самостоятельного изучения студентами весь массив сопутствующих учений и детализаций. Философия при этом становится связующей дисциплиной, интегрирующей весь блок социально-гуманитарных предметов. Поскольку все элементы блока социально-гуманитарных дисциплин влияют друг на друга, необходимо в каждой из них выделить те учения и идеи, которые особенно значимы для других дисциплин этого блока и для культуры в целом. Через внутридисциплинарный отбор, взаимные оценки и последовательные приближения к общему согласию удастся, надо думать, отобрать то базовое содержание социально-гуманитарных дисциплин, без которого невозможна действительно современная образованность специалиста с высшим образованием.

**Список цитированных источников**

1. Философия: типовая учеб. программа для высш. учеб. заведений / Сост.: А.И. Зеленков и др.; под ред. А.И. Зеленкова, Я.С. Яскевич. – Мн.: РИВШ, 2008.

## ПРАВЯДЗЕННЕ КАМАСАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ КОСАЎСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА ў 1921-1939 гг.

Гарматны В.П.
*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск, Беларусь*

Паводле заключанай 18 сакавіка 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы заходнебеларускія землі (у тым ліку і Косаўшчына) трапілі ў склад Польшчы (Другой Рэчы Паспалітай). Тэрыторыя Заходняй Беларусі ў адпаведнасці з агульнапрынятым у Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаваннем была падзелена на ваяводствы, паветы і гміны [5, с. 86-87]. Плошча Косаўскага павета складала 3 561, 4 кв. км., колькасць насельніцтва – 83 696 чалавек (1931 г.).

Пасля Першай сусветнай (1914-1918 гг.) і Савецка-польскай (1919-1921 гг.) войн сельская гаспадарка краю была амаль цалкам разбурана, акрамя таго, ў аграрнай сферы назіраліся шматлікія перажыткі, самымі значнымі з якіх сталі малазямелле і

цераспалосіца – наяўнасць у селяніна некалькіх дробных зямельных надзелаў, размешчаных у даволі аддаленых мясцовасцях. З мэтаю ліквідацыі пераЖыткаў і пераводу мясцовай сельскай гаспадаркі на рынкавыя адносіны польскія ўлады праводзілі ў 1920-1930-я гг. аграрную рэформу, адною са складаючых частак якой стала камасацыя (хутарызацыя) – звядзенне ў адзін раскіданых невялікіх сялянскіх зямельных надзелаў і перанясенне сюды хаты і сельскагаспадарчых пабудоў. Закон аб ажыццяўленні камасацыі прыняты Сеймам Другой Рэчы Паспалітай 31 ліпеня 1923 г. [7].

Перад правядзеннем камасацыі мясцовыя ўлады складалі падрабязны план работ па яе ажыццяўленню, заключалі дамову з вызначаным землямерам аб тэрмінах і ходзе выканання патрабуемых работ, умовах аплаты выкананай працы і г.д. Пры ажыццяўленні хутарызацыі мясцовыя сяляне павінны былі абраць мясцовую раду (савет) ссялення (rada uczestnikow scalenia), акрамя таго, плаціць за камасацыю кожнага гектара, ў залежнасці ад якасці зямлі звычайна ад 15 да 20 злотых, за складанне праектаў і правядзенне меліярацыі і перанясенне дарог, утрыманне землеўпарадчыкаў і г.д. [1, с. 136]. Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў для ажыццяўлення работ па камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум 2 гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі нарматыўна-прававой і тэхнічнай дакументацыі па ссяленню.

Пры правядзенні камасацыі сялянскія зямельныя надзелы ацэньваліся ў грашовым эквіваленце з улікам класіфікацыі ворных зямель па паказчыках ураджайнасці, але, варта адзначыць, што многія заходнебеларускія сяляне былі незадаволены атрыманымі пры ссяленні зямельнымі надзеламі і накіроўвалі скаргі ў мясцовую ваяводскую зямельную ўправу, але на думку прадстаўнікоў польскіх улад, прашэнні сялян не адпавядалі рэчаіснасці і таму не заслугоўвалі ўвагі. Прадстаўнікі Палескай акруговай зямельнай управы (POUZ, ПАУЗ) на скаргі мясцовых сялян звычайна адказвалі, што "хто атрымаў грунты лепшай якасці, той атрымаў іх менш, а хто горшай якасці – той больш", але ў цэлым пры правядзенні камасацыі ў 1921-1939 гг. сяляне вёсак Косаўскага павета атрымоўвалі зямельны надзел па грашовай вартасці прыкладна роўны страчаным.

Так, напрыклад, 20 лістапада 1929 г. селянін вёскі Здзітава Пескаўскай гміны Даніла Васілеўскі скардзіўся ў ПАУЗ, што атрымаў ворную зямлю за 8 км ад свайго жылля на так званых "Krewanskija korcy" ("Крывянскія карчы") (2,5 км ад вёскі), быў незадаволены памерам свайго надзела і казаў аднавяскоўцам: "Забіце мяне, а на гэты хутар не пайду" [4, Арк. 38].

Селянін гэтай жа вёскі Гаўрыіл Жуковіч скардзіўся ў 1929 г., што пры камасацыі кожны селянін запісваўся, дзе хацеў бы атрымаць новы надзел, але сам Г. Жуковіч атрымаў зямлю зусім не ў тым месцы, дзе хацеў, у той жа час як усе ўдзельнікі рады ссялення атрымалі надзелы вельмі добрыя і там, дзе хацелі. Акрамя таго, землямер Мечыслаў Грынкевіч (Mieczyslaw Hrynkiewicz) паміж лугам Г. Жуковіча і лугам яго дачкі Ганны паставіў надзел Данілы Сычыка, што перашкаджала паспяховаму вядзенню асабістай сялянскай гаспадаркі. Усяго каля 20 мясцовых сялян падалі скаргу на няправільную ацэнку асабістых надзелаў і на якасць атрыманай зямлі, большую частку якой на працягу доўгага перыяду складалі паша і няўжыткі.

15 студзеня 1930 г. у вёсцы Здзітава адбыўся разбор скарг мясцовых сялян зямельным інспектарам Ромулусам Глінскім (Romulus Glinski) з удзелам землямера Мечыслава Грынкевіча, рады ссялення, членаў класіфікацыйнай камісіі, скардзячыхся і здзітаўскага солтыса. У выніку слуханняў большасць сялянскіх скарг была прызнана неадпавядаючаю рэчаіснасці, але скарга Г. Жуковіча часткова задавальнялася: надзелы № 463 і 464 памянялі ўладальнікаў – Ганна і Базыль Жуковічы з Данілам Сычыкам. На думку Р. Глінскага, сяляне пісалі свае скаргі пад уплывам трэціх асоб, якія не жадалі правядзення ў вёсцы камасацыі: святара мясцовай праваслаўнай царквы, былога са-

кратара гміны Хомск Драгічынскага павета і войта гміны Борка-Гішчыцкай Косаўскага павета [4, Арк. 297].

Незадаволеныя рашэннем зямельнага інспектара сяляне вёскі Здзітава працягвалі і надалей скардзіцца, з-за чаго праект камасацыі, зацверджаны ўладамі 14 красавіка 1930 г., так і заставаўся праектам. 19 красавіка 1931 г. сяляне азначанай вёскі звярнуліся ў ПАУЗ з просьбаю даць адказ, калі будзе канчаткова зацверджаны праект камасацыі, бо сяляне не ведаюць, што ім рабіць на сваіх атрыманых надзелах: ці засяваць іх вясною, ці рыхтаваць пад азімыя ці люпін, альбо навогул нічога не засяваць на новых надзелах. Па іх словах, чатыры пятых сялян вёскі Здзітава згодны на ссяленне, з пачатку правядзення камасацыі прайшло ўжо два гады, многія сяляне ўжо паспелі перабрацца на новыя надзелы і перанесці сельскагаспадарчыя будынкі.

16 мая 1931 г. сяляне вёскі Здзітава Васіль Данілковіч і Тэадор Мартысевіч звярталіся са скаргай да міністра сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ Вітольда Станевіча з просьбаю незадаволіць несправядлівы на іх думку праект камасацыі вёскі, бо "і дзеці нашыя будуць памятаць гэтую крыўду".

Каля 80 гаспадароў вёскі Здзітава былі незадаволены праектам камасацыі і працягвалі скардзіцца. Так, напрыклад, 14 красавіка 1932 г. на пасяджэнні чарговай зямельнай камісіі па разглядзе скарг мясцовых сялян Гаўрыіл Жуковіч адзначаў, што з'яўляецца малазямельным гаспадаром, але пры камасацыі не атрымаў дадатковай зямлі, з-за чаго не можа паспяхова весці асабістую гаспадарку. Прадстаўнікі рады ссялення мелі на Жуковіча, па яго словах, вялікую злосць і таму далі яму вельмі мала ворнай зямлі.

Рыгор Чайчыц, селянін вёскі Здзітава, скардзіўся на несправядлівае надзяленне зямлёю, але член мясцовай рады ссялення Мікалай Ментуз адказаў яму на скаргу: "Чорт вас бяры, што вам дрэнна, а бы мне было добра". Р. Чайчыц пісаў, што яму "выдзелены хутар, дзе няма пашы, а лугі на адлегласці 3 км, адзін тапелец, дзе пасці жывёлу немагчыма. Прашу замяніць палову майго надзела на адну трэць надзела № 11 Антонія Чайчыца, сын якога быў солтысам і выбраў такі надзел, які хацеў.

14 студзеня 1930 г. падаваў скаргу ў ПАУЗ і атрымаў адказ, што справа будзе разгледжана на пасяджэнні камісіі, дзе кожны з удзельнікаў зможа абараніць свае інтарэсы. Прашу правесці агляд выдзеленага мне надзела" [4, Арк. 346].

Пасля таго, як заслухалі ўсіх скардзячыхся сялян азначанай вёскі, камісія на чале з старшынёю ПАУЗ Войцэхам Буйко (Wojcech Buyko) 14 красавіка 1932 г. пастанавіла праект камасацыі вёскі Здзітава агульнаю плошчаю 3 437, 0911 га зацвердзіць з некаторымі зменамі. Усе скаргі сялян засталіся незадаволенымі як незаслугоўваючыя ўвагі, але на гэтым сяляне не змірыліся і працягвалі скардзіцца далей, але ізноў жа амаль безвынікова [4, Арк. 349].

У 1934 г. 12 сялян вёскі і гміны Целяханы звярнуліся да ваяводскіх улад з просьбаю аб вызваленні ўсіх удзельнікаў хутарызацыі ад аплаты мерных работ і іншых выдаткаў, звязаных з камасацыяй. У сваім прашэнні сяляне падкрэслівалі, што "жыхары в. Целяханы першымі ў гміне падтрымалі хутарызацыю". Вяскоўцы адзначалі, што "гаспадаркі не маюць дадатковых сродкаў на аплату хутарызацыі, паколькі патрэбна пераносіць на новыя месцы жылыя і гаспадарчыя пабудовы, праводзіць дарагія меліярацыйныя работы. Уплыў на стан гаспадарак аказаў і сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг., які значна падарваў магчымасці дадатковай падпрацоўкі на лясных промыслах з-за росту беспрацоўя, на продажы жывёл з-за падзення цэн". Пасля разгляду ўладамі прашэння 82 жыхары Целяхан атрымалі ільготы пры аплаце работ па камасацыі іх зямель [1, с. 138].

6 снежня 1937 г. сяляне вёскі Скураты Косаўскай гміны і павета Міхаіл і Уладзімір Капітанчыкі звярнуліся ў Палескі ваяводскі зямельны аддзел з просьбаю аб пагашэнні запазычанасці па аплаце за хутарызацыю зямель у сувязі з цяжкім асабістым матэ-

рыяльным становішчам: "Мы, ніжэйпадпісаныя землеўласнікі вёскі Скураты Косаўскай гміны і павета, складаем адну сям'ю і валодаем разам 4, 75 га ворнай зямлі і лугоў, знаходзячыхся ў межах вёскі Скураты.

Просім ваяводскую ўправу аб пагашэнні нам аплаты за хутарызацыю зямель нашай гаспадаркі у сувязі з тым, што мы вельмі бедныя і маем вялікую запазычанасць, абцяжарваючую гаспадарку. А менавіта надзельных зямель, запісаных на Капітанчыка Міхаіла, маем толькі 1, 77 га, а іншыя 2, 98 га запісаны на Капітанчыка Уладзіміра і набыты праз былы Расійскі Сялянскі банк. Грошы за іх яшчэ не выплачаны па 30 злотых штомесяц на працягу (наступных) 57 гадоў. Акрамя таго, мы маем запазычанасць па крэдыту, атрыманай з Ашчаднай касы ў Косава-Палескім у суме 384 злотых.

Пры тым мы яшчэ павінны перанесці на хутары нашы пабудовы, якія спарахнелі і патрабуюць поўнага рамонту і лесаматэрыялаў, на што мы не маем ніякіх сродкаў. Яшчэ раз перапаканаўча просім аб спісанні (з нас) аплаты за хутарызацыю нашых зямель. Спадзяемся, што ваяводства зверне ўвагу на нашу галечу і спіша гэтую запазычанасць".

У адказ на гэтую заяву 20 чэрвеня 1938 г. з Палескай ваяводскай зямельнай управы прыйшло паведамленне, што "ў сувязі з пададзенаю заяваю жыхароў вёскі Скураты па пытанню памяншэння памераў аплаты за хутарызацыю зямель і адтэрміноўкі ўнёскаў, прызначаных рашэннем павятовага старасты ў Косава-Палескім, просім паведаміць Капітанчыку Уладзіміру і Капітанчыку Міхаілу, што іх заявы застаюцца без задавальнення за адсутнасцю законных падстаў", але па аплаце за работы па камасацыі азначаным сялянам уладамі была прадастаўлена адтэрміноўка на 2 гады [2, Арк. 20].

У 1938 г. ў Палескі ваяводскі зямельны аддзел звярнуліся жыхары вёскі Скураты (Я. Бурвін, М. Шыманчык, С. Варывода, В. Казімірчык, М. Лушчык, М. Мажэйка, Р. Капітанчык і інш.) з просьбаю аб вызваленні ад аплаты на 2 гады за хутарызацыю зямель, у сувязі з тым, што "перасяленне ў новыя калоніі (сядзібы) патрабуе новага будаўніцтва, звязанага з вялікімі выдаткамі, а ў чэрвені адбыўся моцны град, які знішчыў 80% пасеваў і значна знізіў даходы сялян". Многія вяскоўцы ў заявах адзначалі свае цяжкія жыццёвыя абставіны, такія як вялікая сям'я, недахоп жывёлы і г.д. Напрыклад, Дзям'ян Мажэйка напісаў у сваёй заяве, што яго сям'я "складаецца з 7 чалавек, з якіх 4 – дзеці да 15 год, старэйшы сын – у войску. У гаспадарцы ёсць толькі 1 конь і 1 карова" [1, с. 139]. Па выніках разгляду камісіяй пададзеных просьб сяляне былі часткова вызвалены ад платы за ажыццяўленне хутарызацыі.

Выступаючы пад уплывам агітацыі прадстаўнікоў КПЗБ супраць камасацыі, сяляне праганялі ўрадавых чыноўнікаў і землямераў, знішчалі іх інструменты, цэлымі вёскамі ўступалі ў барацьбу з паліцыяй. Акрамя таго, пасляховаму правядзенню польскімі ўладамі камасацыі на тэрыторыі тагачаснага Палескага ваяводства перашкаджала дзейнасць некаторых левaрадыкальна настроеных паслоў Сейма. Напрыклад, на пачатку чэрвеня 1930 г. пасол Іван (Ян) Грэцкі (пасольскі клуб БСРГ) даведаўся аб плануемым правядзенні камасацыі ў вёсцы Альшаніца і распачаў моцную акцыю пратэсту супраць яе асабіста і пры дапамозе мясцовай ячэйкі КПЗБ [3, Арк. 19, 20].

13 чэрвеня 1930 г. па выкананні распараджэння ПАУЗ у сувязі з узбуйненнем зямельных надзелаў прадстаўнікі Косаўскай павятовай зямельнай управы прыступілі да правядзення абмеру зямель сялян вёскі Альшаніца, аднак, як паведамляў намеснік павятовага старасты Станіслаў Рудніцкі (Stanislaw Rudnicki), у выніку падбухторвання мясцовых камуністаў і актыўнай дзейнасці сеймавага пасла Грэцкага 14 чэрвеня каля 50 жанчын і 20 мужчын з ліку мясцовых сялян, узброеныя кіямі і камянямі, не дапусцілі землямера да працы ў вёсцы па правядзенню хутарызацыі зямлі.

Толькі пасля таго, як паліцыя разагнала выступленне сялян вёскі Альшаніца і павятовы стараста асабіста растлумачыў ім дакладны змест і мэты ўрадавай палітыкі

камасацыі, сяляне супакоіліся і нават 16 чэрвеня 1930 г. прыслалі сваіх рабочых для ажыццяўлення неабходных землямерных работ [5, с. 128-129].

Паводле справаздачы палескага ваяводы па стану на 1 красавіка 1937 г. у Косаўскім павеце была камасавана 21 вёска агульнаю плошчаю зямельных надзелаў у 30 781 га, што складала 26,9% ад патрабуемых работ. Да 1 красавіка 1938 г. польскімі ўладамі планавалася камасаваць у павеце яшчэ 17 вёсак плошчаю 23 317 га (20,4%) [6, s. 15].

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што правядзенне польскімі ўладамі ў 1921-1939 гг. у Косаўскім павеце камасацыі садзейнічала ліквідацыі цераспалосіцы, вылілася ў насаджэнне эканамічна самастойных рынкава арыентаваных фермерскіх гаспадарак, спрыяла распаўсюджванню больш прадукцыйных форм арганізацыі працы і павышэнню ўраджайнасці зямлі, змяншала колькасць працадзён мясцовага сялянства, патрабуемых для апрацоўкі асабістага надзела, садзейнічала станаўленню капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы краю. Працэс хутарызацыі быў доўгім і складаным, бо польскім уладам неабходна было правесці вялікі аб'ём падрыхтоўчых работ і скласці патрабуемыя шматлікія дакументы. Заходнебеларускія сяляне спадзяваліся атрымаць пры ссяленні дадатковую ворную зямлю, але ў польскіх улад адсутнічаў запас свабодных зямель.

**Спісак цытаваных крыніц**

1. Гарады і раёны Берасцейшчыны. Гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён / У.В. Здановіч, С.П. Жлоба, А.І. Пашковіч [і інш.]; пад рэд. А.А. Гарбацкага. – Брэст: Брэсцкая друкарня, 2009. – 564 с.

2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 1965. Решения поветовых староств об определении размера оплаты за проведившиеся работы по хуторизации земель и заявления граждан о предоставлении отсрочек в выплате; сведения об имущественном положении просителей.

3. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 1352. Донесение Косов-Полесского поветового старосты о деятельности депутата Белорусского рабоче-крестьянского депутатского клуба Грецкого Яна на территории Коссовского повета.

4. ДАБВ. – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 1003. Дело об объединении земель деревни Здитово Песковской гмины Коссовского повета за 1929-1935 годы.

5. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Івацэвіцкага раёна / Уклад М.В. Банасевіч [і інш.]. – Мінск: БелТА, 1997. – 494 с.

6. Sprawozdanie wojewody Poleskiego na posiedzenie Rady wojewodzkiej w grudniu 1937 r. – Brzesc-nad-Bugom: Druk Zwiazku Rezerwistow, 1937. – 78 s.

7. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntow // Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1923. – № 92. – Poz. 718. – S. 1050-1056.

## РОЛЬ ЧЕЛОВЕЧЕСКОГО И СОЦИАЛЬНОГО КАПИТАЛА В РЕАЛИЗАЦИИ ПРОГРАММ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЙ МОДЕРНИЗАЦИИ СОВРЕМЕННОГО ОБЩЕСТВА

Домасевич И.В.

*Академия управления при Президенте Республики Беларусь, г. Минск, Беларусь*

Сегодня перед отечественной наукой стоит задача дать собственную оценку дееспособности белорусской модели социально-экономического развития не только в сложившейся кризисный период, но и в прогностическом аспекте. Перед Республикой Беларусь, как, впрочем, и перед любой другой страной на постсоветском пространстве, стоит вопрос, в каком направлении трансформироваться – в индустриальном, развивая промышленность и сельское хозяйство, или в постиндустриальном – уделяя больше внимания развитию отраслей, формирующих интеллектуальные способности человека. Наступает время поиска новых рычагов воздействия на социально-экономическое развитие общества, и очевидным становится человеческий и социальный капитал, которые рассматриваются многими исследователями как ресурсы, которые могут быть использованы для социального и экономического развития.